**КАСЦЕНІЧ Ерафей Васілевіч**. Вучоны ў галіне афтальмалогіі. Доктар медыцыны (1887), прафесар (1893). Нарадзіўся 16.10.1854 г. ў в. Мужычок. Скончыў Магілёўскую гімназію, Пецярбургскую ваенна-медыцынскую акадэмію (1883). З 1894 г. прафесар Варшаўскага ваеннага шпіталя, з 1900 г. загадчык вочнай клінікі і дырэктар вочнай лячэбніцы ў Пецярбургу. У час адпачынкаў бясплатна лячыў і рабіў хірургічныя аперацыі сялянам у Беларусі. Паводле архіўных звестак, у 1894 г. за 2 месяцы ў амбулаторным пакоі в. Рыжкаўка і ў в. Царкоўны Асавец (цяпер Чырвоны Асавец) Быхаўскага раёна, дзе прайшло яго дзяцінства, Е.В.Касценічам было прынята больш за 3 тыс. чалавек, аперацыйную дапамогу атрымалі каля 500 чалавек. У 1903 г. Е.В.Касценіч паспяхова зрабіў аперацыю на воку Дз.І.Мендзялееву. Навуковыя працы па пытаннях афтальмалогіі. Удасканаліў шэраг афтальмалагічных аперацый. Аўтар працы «Развіццё палачак, колбачак і вонкавага ядзернага слоя ў сятчатцы зародка чалавека» (1887) і інш. Памёр 6.1.1906 г. Пахаваны ў в. Чырвоны Асавец, у 1964 г. на магіле пастаўлены помнік.

**Нарадзіліся на Хоцімшчыне** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Хоцімскага раёна / галоўны рэдактар Г. П. Пашкоў. — Мінск, 2003. — С. 513.